УСПАМІНЫ ЯК ВЫРАТАВАЛЬНЫ КРУГ 13

ЦЁПЛА... АДНАК ПРЫХАПІЦЕ ПАРАСОН 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

21 КРАСАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 76 (29956)

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб заняцці на рэспубліканскую Дошку гонару пераможцаў спаборніцтва за 2022 год — усяго 64 арганізацыі і рэгіёны.**
- «АМКАДОР» прадставіў тэхніку на міжнародную выстаўцы «ЖКГ Расіі» ў Санкт-Пецярбургу.
- **Беларусь і Курская вобласць Расіі падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве ў галіне лічбавізацыі.**
- Арына Сабаленка выйшла ў 1/4 фіналу турніру WTA-500 у Штутгарце.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Адна з умоў суверэнітэту — захаванне гістарычнай памяці. У нас была трылогія гадоў малой радзімы. Год народнага адзінства прайшоў у 2021-м. Год гістарычнай памяці выцякаў з папярэдніх, як і сёлетні — Год міру і стваральнай працы. Вывучалі меркаванне аблвыканкамаў, грамадскіх арганізацый, парламента, урада. Перад Годам гістарычнай памяці ў большасці склалася меркаванне, што мы павінны вярнуцца да гісторыі, культурных і духоўных каштоўнасцяў, каб яшчэ раз усвядоміць і прапусціць праз сябе, а самае важнае — прывіваць і выхоўваць на гэтым дзяцей і моладзь. Пры гэтым галоўнае — не колькасць мерапрыемстваў, а іх змястоўнае напаўненне».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«З ПІЦЕРАМ У НАС ВЕЛЬМІ ЦЁПЛЫЯ, ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ, І ГЭТА ВІДАЦЬ НА ПРАКТЫЦЫ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Санкт-Пецярбурга Аляксандрам Бягловым. У цяперашні час праходзіць візіт дэлегацыі Санкт-Пецярбурга ў Беларусь. На парадку дня — пытанні эканамічнага, прамысловага, гуманітарнага, навуковага супрацоўніцтва. Гэтыя і іншыя аспекты падчас рабочай сустрэчы абмеркавалі Аляксандр Лукашэнка і Аляксандр Бяглоў.

Фота БелТА.

«Шчыра рады зноў вітаць як самых добрых і блізкіх суседзяў, якія прадстаўляюць наш родны горад Ленінград, сёння Санкт-Пецярбург. Вы ведаеце маё асаблівае стаўленне да вашага горада — працаўніка і героя. Я часта параўноўваю Ленінград з Беларуссю, бо ў гісторыі не было такіх мясцін, якія б ад вайны пацярпелі так, як Беларусь і Ленінград. Мы з вялікай цеплынёй ставімся да ленінградцаў, якія пасля вайны прыехалі сюды і зрабілі вельмі шмат для адраджэння Беларусі, асабліва ў навуцы і адукацыі», — прывітаў гасцей кіраўнік дзяржавы. Карыстаючыся выпадкам, ён падзякаваў дэлегацыі з Санкт-Пецярбурга і Ленінградскай вобласці, якія прыязджалі ў сакавіку на адкрыццё музея, прымеркаванае да 80-й гадавіны трагічных падзей у Хатыні.

«Мы бачым, што сёння нацысты, фашысты і іншая дрэнь, дэструктыўныя сілы спрабуюць перапісаць гісторыю, адмаўляць наш агульны ўклад у Вялікую Перамогу і апраўдаць свае злачынныя дзеянні і таго часу, і сённяшнія. Праз канфлікт ва Украіне ўцягваюць нас усіх у трэцюю сусветную вайну. Я перакананы: у іх тады не атрымалася, не атрымаецца і цяпер тым больш», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, наперадзе чакае вялікая работа па ўмацаванні брацкага саюза Беларусі і Расіі, які ён назваў апорай праўды і свабоды на прасторы СНД і за яе межамі. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што велізарны ўклад ва ўмацаванне саюзніцкіх адносін уносяць рэгіёны Расійскай Федэрацыі. Ён падкрэсліў, што калі б у свой час не было б сувязяў з рэгіёнамі Расіі, то і цяперашніх адносін Беларусі і Расіі таксама не было б.

«Мне імпануе ваш падыход да рашэння задач, якія мы разам ажыццяўляем. Калі ўжо кіраўніцтва Санкт-Пецярбурга бярэцца за нейкае пытанне, то вырашае яго маштабна, якасна і ў тэрмін. Запэўніваю вас, што такое стаўленне будзе і з боку Беларусі да нашага Піцера», — сказаў беларускі лідар.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, вынікі супрацоўніцтва Беларусі і Санкт-Пецярбурга ў 2022 годзе ўражваюць: «2 мільярды 200 мільёнаў — не кожная дзяржава ў свеце можа пахваліцца такім тавараабаротам, як у нас. Ведаю, што сёлета ўжо ў лютым мы прыраслі ў 1,4 раза. А ў экспарце беларускай прадукцыі — у 1,7 раза. Гэтым перш за ўсё абумоўлены нашы цесныя і зацікаўленыя адносіны з Пецярбургам.

СТАР. 2

Разумныя грошы

Куды ўкласці свае фінансы

Дэпазіты, новыя аблігацыі, золата і макарона...

Мінулы год быў дастаткова валатыльны для інвестараў. Куды ўкладваць грошы налета і як дыверсіфікаваць свой інвестыцыйны партфель так, каб знізіць рызыкі і атрымаць добрую прыбытковасць? Каманда беларускіх аналітыкаў разам з журналістам газеты падрыхтавала дайджэст перспектыўных інвестыцый на бягучы год.

СТАР. 4

Далучайцеся!

ВАЖНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Сёлета, у Год міру і стваральнай працы, рэспубліканскі суботнік збярэ каля трох мільёнаў добраахвотнікаў для навядзення парадку на значных для кожнага рэгіёна і ўсёй краіны аб'ектах. Гэта тэрыторыі саміх населеных пунктаў: бальніцы, паркі, сацыяльныя ўстановы, а таксама мемарыяльныя комплексы, помнікі, месцы баявой і воінскай славы, пахаванні часоў Вялікай Айчыннай вайны. Асобная катэгорыя аб'ектаў — гісторыка-культурныя каштоўнасці.

Зароблены на суботніку сродкі будуць акумуляваны на спецыяльных рахунках раённых і гарадскіх выканкамаў, потым іх пералічаць на асобныя рахункі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. Тыя, у сваю чаргу, перавядуць грошы на асобны банкаўскі рахунак Міністэрства фінансаў па ўліку сродкаў рэспубліканскага суботніка ў Нацыянальным банку.

Летась такім чынам было сабрана амаль 12 мільёнаў рублёў. Усе сродкі пайшлі на рамонт і мадэрнізацыю мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Сёлета плануецца сабраць такую ж суму. Яна будзе падзелена пароўну: палову накіруюць на рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне Гомельшчыны, палову — на стварэнне рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці.

Але, акрамя збору сродкаў, суботнік нясе ў сабе больш глыбокі сэнс: яднанне людзей вакол добрай і патрэбнай справы, якую мы робім разам. Робім дзеля сябе і дзеля сваёй краіны. Дзеля сваіх дзяцей.

СТАР. 3

«З ПІЦЕРАМ У НАС ВЕЛЬМІ ЦЁПЛЫЯ, ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ, І ГЭТА ВІДАЦЬ НА ПРАКТЫЦЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ведаю, што і ў вас вялікая цікавасць да Беларусі. Будзьце ўпэўненыя, мы гатовыя аддаць апошняе, каб рэалізаваць тое, пра што мы дамовіліся».

Прэзідэнт падзякаваў кіраўніцтву Санкт-Пецярбурга за магчымасць удзелу беларускіх прадпрыемстваў у маштабнай транспартнай рэформе гарадскога пасажырскага парка. «Мы будзем рабіць усё, каб нашы родныя людзі ў Піцеры атрымалі самы сучасны і якасны прадукт з Беларусі», — запэўніў ён. Так, летась больш за тысячу аўтобусаў МАЗ выйшла на гарадскія маршруты Паўночнай сталіцы. Працягваюцца пастаўкі тралейбусаў «Белкамунмаша».

«Ведаю, што вы хочаце ў нас закупіць аўтобусы самай вялікай умяшчальнасці, гэта правільна, мы таксама такім шляхам ідзём, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Вітаем планы Санкт-Пецярбурга па выкарыстанні электробусаў. У Мінску напрацаваны сур'ёзны вопыт эксплуатацыі гэтай навінкі. Гатовыя ім дзяліцца, калі ў вас будзе зацікаўленасць нашым досведам. Як мяне інфарміравалі, добра сябе зарэкамендавала мінулай зімой на вуліцах вашага горада беларуская камунальная тэхніка», — сказаў ён. Прэзідэнт Беларусі ўспомніў выпадак, калі Прэзідэнт Расіі вырашыў паказаць лідарам замежных краін свой родны горад. «Я наогул быў уражаны чысцінёй і парадкам у Піцеры, прынамсі, там, дзе я пабываў. Я думаў, што Мінск — самы чысты горад. Я прыехаў сюды, і ў Мінску ў нас была прадметная размова з мэрам. Кажу: трэба ехаць у Піцер вучыцца, як прыбіраць. Хоць мае словы чамусьці былі падвергнутыя крытыцы некаторымі сродкамі масавай інфармацыі ў вас. Мяне гэта здзівіла. Але я тое, што ўбачыў, пра тое і сказаў», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.

Адной з тэм размовы Прэзідэнта і расійскага губернатара стала прадукцыя «Магілёўліфтмаш». «Я ведаю, што ў вас, як і ў нас, ідзе мадэрнізацыя старога жыллёвага фонду, натуральна, патрэбныя ліфты, а ліфтавыя шахты прыстасаваныя да савецкіх ліфтаў. Мы захавалі памеры, але павялічылі якасць ліфтавага абсталявання. Калі вам гэта падыходзіць — паглядзіце. З іншых месцаў у свеце шмат набываюць нашы ліфты. Але мы забяспечым Піцер усім неабходным», — сказаў Прэзідэнт.

У двухбаковым дыялогу нязменна прысутнічае тэма харчовай бяспекі. У структуры беларускага экспарту ў Санкт-Пецярбургу пастаўкі прадуктаў харчавання стабільна займаюць першае месца, дасягаючы 40 і больш працэнтаў. «З Піцерам у нас вельмі цёплыя, добрыя адносіны, і гэта відаць на практыцы. Мы будзем пастаўляць самую якасную прадукцыю на вашы рынкі. І скаргаў не было на тое, што ў нас з прадуктамі харчавання нешта не так. Вы ведаеце, што мы захавалі нашы стандарты савецкіх часоў. Толькі ад прадуктаў харчавання мы нагандлявалі больш за восем мільярдаў долараў. Ні адна галіна столькі не прынесла нам даходу, колькі гэтая. І гэта звязана з якасцю», — расказаў беларускі лідар. Ён адзначыў, што ні з адным іншым рэгіёнам няма такога аб'ёму гандлю, як з Санкт-Пецярбургам.

На сустрэчы Прэзідэнта і расійскага губернатара была названа толькі частка напрамкаў, па якіх узаемадзейнічаюць Беларусь і Санкт-Пецярбург. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, з пункту гледжання кароткатэрміновай перспектывы Санкт-Пецярбург і Беларусь — самыя запатрабаванныя ў расіян экскурсійныя маршруты. «Нам з вамі таксама трэба падумаць, як павялічыць турыстычныя абмены. Можа быць, варта пачаць з арганізацыі максімальна зручных транспартных зносін. Пасля створым сумесныя турыстычныя прадукты і аб'яднаем наведванне Паўночнай сталіцы і Беларусі», — прапанаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Беларусі і Санкт-Пецярбургу ёсць над чым працаваць па ўсіх напрамках — гуманітарным, прамысловым, у сельскай гаспадарцы. «Мы праводзім работу па фарміраванні лагістыкі праз ваш горад, будуем лагістычную інфраструктуру. Заняліся будаўніцтвам партоў у вас і ў Мурманску. На Бронцы ўжо працуе порт, мы яго маем намер пашыраць, тут пытанняў у нас няма. Вельмі сур'ёзна будзем развіваць супрацоўніцтва з Санкт-Пецярбургам», — адзначыў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ **У тэму**

ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ НАЗІРАЕЦЦА ПЕРАВЫКАНАННЕ ПЛАНАЎ

У размове з журналістамі Аляксандр Бяглоў расказаў, што супрацоўніцтва Беларусі і Санкт-Пецярбурга дынамічна развіваецца ва ўсіх галінах: у прамысловасці, ахове здароўя, харчовай прамысловасці, адукацыі, турызме. «На ўсіх напрамках у нас назіраецца перавыкананне нашых планаў, якія мы вызначалі. Сёння мы падпішам шэраг дадатковых дагавораў, якія пашыраюць гарызонты нашага супрацоўніцтва да 2026 года», — сказаў ён. Губернатар Санкт-Пецярбурга прывёў прыклад, які пацвярджае дынаміку супрацоўніцтва. На першым харчовым форуме ў Санкт-Пецярбургу летась былі заключаны кантракты ад двух да пяці мільярдаў расійскіх рублёў. Сёлета на форуме заключылі кантрактаў на 14,5 мільярда.

Аляксандр Бяглоў асобна вылучыў беларускую тэхніку, якая працуе ў Санкт-Пецярбургу, — аўтобусы, тралейбусы, камунальная тэхніка, трактары. «Мы дамовіліся аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў, сэрвісных цэнтраў. Я хачу сказаць, што паміж Санкт-Пецярбургам і Беларуссю няма ніякіх супярэчнасцяў ні на якім узроўні. Прэзідэнты далі даручэнні па арганізацыі лагістыкі, транспартнага грузаабароту. Мы займаемся портам Бронка — гэта каля сямі мільёнаў тон беларускіх тавараў, якія пройдуць. Вядзецца пытанне аб пашырэнні з 7 да 20 мільёнаў тон. Турызм добра развіваецца. Жыхары нашага горада вельмі любяць беларускія здраўніцы», — расказаў Аляксандр Бяглоў.

Асобна губернатар вылучыў моцную каманду беларускага Прэзідэнта. Ён расказаў, што калі прымалася рашэнне аб закупцы аўтобусаў, беларускія вытворцы ўлічылі пажаданні і прапановы піцерцаў. «Самае галоўнае, што ўдалося зрабіць беларускім вытворцам, — перайсці на газаматорнае паліва. Гэта было адной з нашых умоў, паколькі Санкт-Пецярбург — вялікі горад. І сёння практычна ўсе аўтобусы, якія пастаўляе Беларусь, працуюць на газаматорным паліве. Але мала таго. Мы дамовіліся, што ўся беларуская камунальная тэхніка будзе на газаматорным паліве», — адзначыў ён.

На кантролі

Будаўніцтва ідзе па графіку

А большасць вытворчых плошчаў на пляцоўцы сталічнага «Мотавелазавода» ўжо размеркавана

Учора ўпаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта па горадзе Мінску, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА праінспектавала вытворчую пляцоўку ТАА «Мінскі гарадскі тэхнапарк». Спікер азнаёмілася з будаўніцтвам і рэканструкцыяй карпусоў і правяла нараду з кіраўніцтвам «Мотавелазавода». Яна канстатавала, што работы ідуць у адпаведнасці з графікам, а месцамі нават з апераджэннем, а вялікая частка будучых вытворчых карпусоў і плошчаў ужо зарэзервавана.

Спікер Савета Рэспублікі нагадала, што ў 2021 годзе, пасля наведвання прадпрыемства Прэзідэнтам краіны, быў распрацаваны пратакол даручэнняў. У адпаведнасці з ім павінны выконвацца работы на гэтай пляцоўцы.

— Размова ішла не толькі пра павелічэнне прадукцыі, якая выпускаецца, і ўзроўні лакалізацыі. Прэзідэнт паставіў задачу выпускаць новыя віды прадукцыі, якія будуць запатрабаваны. І другое не менш важнае пытанне — навядзенне парадку на гэтай тэрыторыі, эфектыўнае выкарыстанне будынкаў. Я ведаю, што ў вас праводзяцца штабы па будаўніцтве, зносе будынкаў. І мушу сказаць, што вы не падводзіце: усё тое, што намецілі, выконваецца. Усе пытанні, якія запланаваны, вырашаюцца ў адпаведнасці з тэрмінамі. Будаўнікі даволі эфектыўна і хутка працуюць.

Наталля Качанава пацікавілася, ці дастаткова 400 задзейнічаных на пляцоўцы рабочых, і выказала спадзяванне, што да канца 2023 года будуць пабудаваны і новыя вытворчыя плошчы і праведзена рэканструкцыя будынкаў.

Акрамя таго, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла той факт, што большая частка будучых вытворчых плошчаў ужо зарэзервавана.

— Радуе тое, што сёння Мінскі гарадскі тэхнапарк практычна за той час, у які вядзецца будаўніцтва, ужо вызначыўся з прадпрыемствамі, якія тут будуць размяшчацца. Са 150 тысяч плошчаў практычна 120 тысяч ужо занятыя. Правільна было прынята рашэнне, што тут будзе размешчана менавіта вытворчасць. Безумоўна, гэта тыя прадпрыемствы, якія можна размясціць амаль у цэнтры горада. Канешне, павінны быць выкананы ўсе экалагічныя патрабаванні і вытворчасці павінны быць экалагічна бяспечныя, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна расказала, што ў верхняй палаце парламента неаднаразова праходзілі сустрэчы з кіраўнікамі розных сумежных прадпрыемстваў, якія могуць пастаўляць камплектуючыя для «Мотавела».

— Прэзідэнт дакладна сказаў, што не менш за 50 % павінна быць лакалізацыя па веласіпедах і матацыклах. Плюс новыя вытворчасці — прадукцыя, якую вы мне паказалі, самакаты. Тады казалі: фары не зможам вырабляць, тое не зможам. Аднак знайшлі, хто можа вырабіць і паставіць. У нас дастаткова прадпрыемстваў, якія займаюцца выпускам таго, што можа быць камплектуючымі для вашай прадукцыі.

Спікер падкрэсліла, што варта імкнуцца да тэхналагічнай незалежнасці ад імпартных паставак.

— На сесіі МПА СНД і на Вышэйшым дзяржсавеце Саюзнай дзяржавы было агучана, што ў нас адзіная прамысловая палітыка. Калі сёння не толькі Беларусі патрэбныя шыны для веласіпедаў, але і Расіі, то чаму б нам сёння не стварыць вытворчасць па выпуску такіх шын ці не наладзіць іх вытворчасць на ўжо існуючай «Белшыне». Мы вырабляем такія буйнагабарытныя шыны, а для веласіпедаў — не. Таму мы яшчэ абавязкова вернемся да гэтага пытання і дэталёва ўсё абмяркуем.

Па прыкладзе Мінскага гарадскога тэхнапарка будуць развіваць і іншыя тэрыторыі ў сталіцы, якія сёння выкарыстоўваюцца недастаткова эфектыўна, адзначыла Наталля Качанава.

— Ахвотныя адкрыць вытворчасць ёсць, бо тут ёсць прэферэнцыі па падаткаабкладанні, пастаўках абсталявання.

Як адзначыў **дырэктар Мінскага гарадскога тэхнапарка Уладзімір ДАВІДОВІЧ,** плошча ў 120 тысяч квадратных метраў размеркаваная не толькі паміж прадпрыемствамі, якія арандуюць плошчы Мотавелазавода, але і рэзідэнтамі звонку.

— Мы з імі працуем, яны пройдуць экспертны савет і ў 2023—2024 гадах зоймуць свае дастойныя месцы і будуць папаўняць бюджэт краіны, — расказаў ён. — Была пастаўлена задача, каб усе працэсы праходзілі без спынення вытворчасці і «Мотавелазавода», і мы стараемся па максімуме задзейнічаць прадпрыемствы, якія арандуюць у нас тэрыторыю і будынкі. Уладзімір Давідовіч дадаў, што было вылучана 19 чэргаў рэканструкцыі і работы вядуцца па кожнай з іх. Ядро праекта — галоўны корпус, дзе будзе сканцэнтравана вытворчасць «Мотавелазавода».

Алена КРАВЕЦ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Блізкая ўлада

Наталля Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян

27 красавіка 2023 г. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Іванаўна Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, паведамілі ў Савеце Рэспублікі.

Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца 21 і 26 красавіка з 11.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00 па тэлефонах: 8-017-328-53-24, 8-017-328-58-11.

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 22 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8-016 226 99 26;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Генадзь Іванавіч ДЗЕНГАЛЁЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Таццяна Мікалаеўна ШАЎЦОВА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Школа, мемарыял, паліклініка...

У Гродзенскай вобласці суботнік пройдзе на знакавых аб'ектах і сельскагаспадарчых палетках

Ва ўсіх раёнах і абласным цэнтры вызначаны месцы работы па навядзенні парадку. Акцэнт будзе зроблены на добраўпарадкаванне населеных пунктаў, гісторыка-культурных аб'ектаў, мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы, сацыяльных аб'ектаў, у тым ліку аздараўленчых летнікаў, стадыёнаў, паркаў. У сельскай мясцовасці аграрыі правядуць працоўны дзень на палявых работах.

У маштабнай кампаніі возьме ўдзел каля 280 тысяч чалавек. У абласным цэнтры галоўнымі пунктамі прымянення сіл стане работа на будаўніцтве школы і паліклінікі ў двух новых мікрараёнах горада. Падчас суботніка навядуць парадак на тэрыторыі воінскага пахавання ў мікрараёне Фолюш, дзе з 1941 да 1943 года існаваў лагер для ваеннапалонных — Шталаг-324. У пачатку вайны ён знаходзіўся на ўскраіне ваеннага гарадка.

У 2008 годзе падчас будаўнічых работ па пашырэнні горада тут былі знойдзены шматлікія чалавечыя астанкі, частка якіх перапахавана на гарадскіх могілках у брацкай магіле. А на месцы самога лагера створаны мемарыяльны комплекс. У 2016 годзе побач з абелiскам адбылося перапахаванне 1600 знойдзеных пазней астанкаў, асобы многіх удалося ўстанавіць дзякуючы медальёнам.

Дарэчы, падчас леташняга суботніка на добраўпарадкаванні тэрыторыі мемарыяла «Шталаг-324» вяліся работы з удзелам кіраўніцтва вобласці.

Трэба сказаць, што да рэспубліканскага суботніка 22 красавіка далучыцца звыш тысячы актывістаў абласнога і раённых камітэтаў БРСМ, якія будуць працаваць на 50 аб'ектах рэгіёна. Сярод іх — добраўпарадкаванне Швейцарскай даліны ў Гродне, Шведскай гары ў Ваўкавыску, мемарыяла памяці ахвяр Першай сусветнай вайны ў Смаргоні, гарадскога парку ў Дзятлаве. Не застанецца без увагі ніводнае месца, звязанае з баявой і воінскай славай рэгіёна.

Гродзенцамі мяркуецца пералічыць у фонд суботніка 872 тысячы рублёў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

Не збаўляць тэмпы мінулага года

На Гомельшчыне абласны суботнік прайшоў у Азарычах

На рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне Гомельскай вобласці накіруюць 50 працэнтаў сродкаў, зароблены падчас правядзення рэспубліканскага суботніка.

Жыхары Гомельшчыны ўжо зрабілі свой уклад у аднаўленне знакавага не толькі для рэгіёна, але і для краіны ў цэлым месца памяці ў Азарычах. Так, 18 сакавіка абласны суботнік сабраў больш за 500 тысяч неабыякавых жыхароў вобласці. Паводле інфармацыі абласнога штаба па правядзенні і арганізацыі суботніка, было сабрана больш за тры мільёны рублёў, што амаль удвая больш, чым летась. Гэтыя сродкі таксама пойдуць на ажыццяўленне маштабнага патрыятычнага праекта ў Калінкавіцкім раёне.

Паводле апошніх звестак, у Гомельскай вобласці ўстаноўлена 101 месца прымусовага ўтрымання мірнага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Лагер смерці «Азарычы» — адно з самых жорсткіх месцаў знішчэння людзей на Беларусі.

Падчас суботнікаў у рэгіёне штогод асаблівая ўвага прадстаўнікоў улады, дэпутатаў, працоўных калектываў — менавіта навядзенню парадку на мемарыяльных комплексах, воінскіх пахаваннях, парках Перамогі ў райцэнтрах і знакавых месцах памяці ў сельскіх населеных пунктах.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Добраўпарадкаванне і азеляненне

На Віцебшчыне суботнік супадае з «Тыднем лесу»

Заўтра ў краіне пройдзе рэспубліканскі суботнік, у якім плануюць узяць удзел тры мільёны беларусаў. Жыхары паўночнага рэгіёна актыўна падключыліся да навядзення парадку на зямлі загадзя ў межах шматлікіх акцый раённага і гарадскога маштабаў.

Сімвалічна, што на Віцебшчыне рэспубліканскі суботнік сёлета супаў з фінальным днём правядзення рэспубліканскай акцыі «Тыдзень лесу — 2023». Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін разам з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый і работнікамі лясной гаспадаркі ўнясуць свой уклад у добраўпарадкаванне і азеляненне Бешанковіцкага лясніцтва.

На мінулым тыдні 13 красавіка ў горадзе на Дзвіне стартавала ўсегарадская акцыя «Чысты чацвер», якая працягвае набіраць абароты ў прадпрыемствах і арганізацыях, установах адукацыі і аховы здароўя. Выходным пунктам працоўнага дэсанта пад кіраўніцтвам губернатара стала Успенская горка і Свята-Успенскі кафедральны сабор. Да добрай справы падключыліся работнікі ААТ «Віцязь», Віцебскі абласны клінічны радзільны дом, РУП «Беларуснафта» — Віцебскаблнафтапрадукт і іншыя арганізацыі, школьнікі і члены патрыятычных клубаў. Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый Віцебскай вобласці талакой наводзілі парадак на воінскім мемарыяле ў аграгарадку Заронава, дзе пахавана звыш 10,5 тысячы байцоў Чырвонай Арміі.

Па выніках рэспубліканскага суботніка Віцебшчына плануе зарабіць каля 1,28 мільёна рублёў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Мігель Дыяс-Канель Бермудэс пераабраны на пасаду прэзідэнта Кубы

Парламент Кубы пераабраў на пасаду прэзідэнта рэспублікі Мігеля Дыяс-Канеля Бермудэса. Тэрмін яго паўнамоцтваў працягнуты да 2028 года, паведаміла ТАСС. За кандыдатуру Дыяс-Канеля прагаласавалі 459 дэпутатаў з 462. Таксама былі прадоўжаны тэрміны паўнамоцтваў віцэ-прэзідэнта Сальвадора Вальдэса Месы. На пасаду прэм'ер-міністра быў пераабраны Мануэль Марэра. Большасцю галасоў таксама быў зацверджаны склад кубінскага ўрада.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мігеля Марыа Дыяс-Канеля Бермудэса з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Куба. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Вынікі галасавання сведчаць аб вашым высокім палітычным аўтарытэце і шырокай падтрымцы курсу на захаванне і прымнажэнне дасягненняў Рэвалюцыі, які праводзіцца ў гістарычны як для Кубы, так і для ўсяго свету перыяд, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Перакананы, што вы з гонарам апраўдаеце аказаны давер брацкага кубінскага народа і паспяхова справіцеся з выклікамі, якія стаяць перад дзяржавай у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах. Спадзяюся на працяг канструктыўнага дыялогу Мінска і Гаваны і цеснай сумеснай работы па развіцці адносін усёабдымнага беларуска-кубінскага партнёрства і стратэгічнага ўзаемадзеяння», — адзначаецца ў віншаванні.

Гандлёвы дэфіцыт Японіі дасягнуў рэкорднага ўзроўню $160 млрд

Гандлёвы дэфіцыт Японіі ў 2022 фінансавым годзе, які завяршыўся 31 сакавіка 2023-га, дасягнуў рэкорднага ўзроўню $160 млрд, паведаміла ТАСС са спасылкай на Міністэрства фінансаў краіны. Дэфіцыт гандлёвага балансу павялічыўся амаль у чатыры разы ў параўнанні з паказчыкам 2021 фінансавага года, дасягнуўшы самага вялікага памеру з 1979-га, калі ў краіне пачалі весці статыстыку сёлетняга ўзору. Аб'ём імпарту за год павялічыўся на 32,2 працэнта — амаль да 121 трыльёна іен ($891 млрд) у першую чаргу за кошт рэзкага росту цэн на энерганосьбіты, прадукты харчавання і прамысловую сыравіну. Японскі экспарт узрос на 15,5 працэнта, перавысіўшы 99,2 трыльёна іен (амаль $731 млрд). У свеце на фоне аслаблення пандэміі ўзрос попыт на японскія аўтамабілі і іншую прамысловую прадукцыю, аднак даходы ад яе продажу не змаглі кампенсаваць рэзкае падарожанне імпарту, канстатуе інфармацыйнае агенцтва Kyodo.

Звыш 90 чалавек загінула ў цісканіне пры раздачы міласціны ў Емене

Больш за 90 чалавек загінула, яшчэ звыш 300 пацярпела ў цісканіне пры раздачы міласціны, якая адбылася ў Емене, паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал Sky News Arabia. Паведамляецца, што міласціну тым, хто мае патрэбу, раздавалі некалькі гандляроў проста ў цэнтры горада, у выніку чаго ўзнікла цісканіна. Двое з бізнесменаў ужо пад арыштам. Расследаваннем здарэння займецца камісія, куды ўвойдуць супрацоўнікі пракуратуры і органаў унутраных спраў.

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже транспортного средства – автомобиля MITSUBISHI GRANDIS, находящегося в собственности Республики Беларусь и закрепленного за РУП «Институт недвижимости и оценки» на праве хозяйственного ведения

Дата проведения аукциона: 22 мая 2023 г. в 11.00. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7

№ лота	Наименование, краткая характеристика объекта	Начальная цена, рублей, в т. ч. НДС 20 %	Задаток, рублей, в т. ч. НДС 20 %
1	**Автомобиль MITSUBISHI GRANDIS,** рег. знак 3532 ВВ-3, 2007 года выпуска. Цвет: серо-бежевый металлик. Тип: легковой минивэн (MINIVAN). Номер кузова (рамы): JMBLRNA4W7Z001318. Объем двигателя: 2400 см³. Вид топлива: бензин. Коробка передач – автоматическая. Состояние: удовлетворительное	**7 247,39**	**724,74**
		Шаг аукциона: 5 %	
Местонахождение объекта: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Артёма, 23			
Продавец (Организатор аукциона): Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47, 32-18-95; +375 29 170-46-47, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by			

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 19.05.2023 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные юридические лица, граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства, если иное не установлено законодательными актами, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления, заключившие с организатором торгов соглашение и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **22 мая 2023 г.**

К заявлению на участие в аукционе прилагаются:

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении;

• юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

• иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

• представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский языки.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и иметь при себе все необходимые реквизиты по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления, начиная с момента публикации настоящего извещения до 16.00 19.05.2023 г. на **р/с № BY49 AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, получатель платежа: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 401166490, назначение платежа:** задаток для участия в аукционе 22.05.2023 г. по лоту № 1.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), будет засчитан в счет окончательной стоимости предмета торгов. Задатки, уплаченные участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. В случае письменного отзыва данного заявления либо неявки участника торгов на торги сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты его проведения.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе. Лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан: в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется до начала аукциона; в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола аукциона подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов; в течение 30-ти календарных дней с момента подписания договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке, за исключением случаев оплаты в рассрочку. Рассрочка оплаты стоимости приобретенного имущества предоставляется в соответствии с действующим законодательством.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет две базовые величины за каждый случай нарушения.

Альфа-Банк

Закрытое акционерное общество «Альфа-Банк»»

220013, Минск, ул. Сурганова, 43-47,
тел.: (017) 217-64-63, 217-64-59, факс (017) 200-59-29
Телекс 252190 ITIB BY, SWIFT ALFA BY 2X

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС по состоянию на 01.04.2023

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2023	2022
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	695 777	375 010
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		
4	Средства в Национальном банке	1103	491 228	848 983
5	Средства в банках	1104	229 712	224 832
6	Ценные бумаги	1105	385 444	371 925
7	Кредиты клиентам	1106	2 694 258	2 525 884
8	Производные финансовые активы	1107	50	1 677
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	0	0
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	124 845	120 881
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	1 046	1 196
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	1 759	1 759
13	Отложенные налоговые активы	1112		
14	Прочие активы	1113	62 306	61 473
15	**ИТОГО АКТИВЫ**	**11**	**4 686 425**	**4 533 620**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	0	0
18	Средства банков	1202	207 662	128 960
19	Средства клиентов	1203	3 325 253	3 328 246
20	Ценные бумаги банка	1204	187 585	145 203
21	Производные финансовые обязательства	1205	46	604
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		
23	Прочие обязательства	1207	72 963	77 272
24	**Всего обязательства**	**120**	**3 793 509**	**3 680 285**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	70 422	70 422
27	Эмиссионный доход	1212		
28	Резервный фонд	1213	150 000	129 103
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	52 165	52 273
30	Накопленная прибыль	1215	620 329	601 537
31	**Всего собственный капитал**	**121**	**892 916**	**853 335**
32	**ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**	**12**	**4 686 425**	**4 533 620**

Председатель Правления В.С. Смоляк

Главный бухгалтер А.В. Скрипка

Дата подписания: 03 апреля 2023 г.

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ по состоянию на 01.04.2023

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2023	2022
1	Процентные доходы	2011	98 467	83 941
2	Процентные расходы	2012	19 749	21 402
3	**Чистые процентные доходы**	**201**	**78 718**	**62 539**
4	Комиссионные доходы	2021	52 462	45 688
5	Комиссионные расходы	2022	9 277	9 525
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**	**43 185**	**36 163**
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-44	-304
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	28 423	74 479
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-484	34 602
11	Чистые отчисления в резервы	207	31 829	62 151
12	Прочие доходы	208	2 419	2 723
13	Операционные расходы	209	62 735	80 294
14	Прочие расходы	210	7 011	4 537
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	50 642	63 220
16	**Расход (доход) по налогу на прибыль**	**212**	**11 077**	**11 448**
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**39 565**	**51 772**

Председатель Правления В.С. Смоляк

Главный бухгалтер А.В. Скрипка

Дата подписания: 03 апреля 2023 г.

С отчетностью вы также можете ознакомиться на сайте: alfabank.by/about/reporting/

УНП 101541947

Куды ўкласці свае фінансы

НАДЗЕЙНАЯ АСНОВА ДЛЯ ІНВЕСТАРА

Банкаўскія дэпазіты заўсёды застаюцца важнай часткай інвестыцыйнага партфеля. Гэта самая надзейная стратэгія размяшчэння свабодных грашовых сродкаў. На бягучы момант амаль усе банкі прапануюць уклады не занадта вялікай даходнасці. Як вядома, з 3 красавіка ў нашай краіне адбылося зніжэнне стаўкі рэфінансавання да 10,5 % гадавых. Таму менавіта ў красавіку было нязначнае зніжэнне ставак па дэпазітах у беларускіх рублях з той жа прычыны — значная частка ўкладаў прывязваная да ўзроўню стаўкі рэфінансавання.

Разгледзім спачатку прапановы самых надзейных сістэмных банкаў. Напрыклад, у Беларусбанку прапануюць пакласці свае грошы на 13 месяцаў на безадзыўны дэпазіт пад 13 % гадавых. Праўда, гэтая стаўка будзе зменнай, таму што яна становіцца гібкай у залежнасці ад стаўкі рэфінансавання Нацбанка. Ёсць у самым буйным банку краіны ўклад «Класік Безадзыўны» на адзін год пад фіксаваную стаўку. Яна трошкі меншая — 11,9 % гадавых. Гэта мы адшукалі ў згаданага банка самую вялікую прыбытковасць пры ўкладзе на год.

Памяншэнне тэрмінаў дэпазітаў аўтаматычна памяншае і саму працэнтную стаўку. Уклад на 45—90 дзён прадугледжвае ўжо стаўку да 5—6 % гадавых. Адзыўныя кароткія дэпазіты маюць мінімальную даходнасць, абмежаваную 3—4 % гадавых.

Калі разглядаць іншыя сістэмныя банкі, такія як Белгазпрамбанк або «Дабрабыт», то ў іх максімальныя працэнтныя стаўкі трохі вышэйшыя, але ненамнога. Дэпазіты ў гэтых банкаў на 370 дзён, адкрытыя з дапамогай дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, прадугледжваюць фіксаваны даход ад 12 % да 13 % гадавых. Ёсць у згаданых укладаў пэўныя ўмовы. Кліент банка павінен быць уладальнікам пластыкавай карткі рублёвага рахунку, а мінімальная сума ўкладу не можа быць меншай за 500 рублёў (або 1000 рублёў).

У іншых камерцыйных банкаў прапановы па ўкладах могуць адрозніваца ад пералічаных, але... Ні ў кога з фінансавых інстытутаў фіксаваная стаўка па дэпазіце на год не вышэйшая чым 13 % гадавых. Стаўка будзе вышэйшай, толькі калі яна пераменная.

ЮАНЬ У ТРЭНДЗЕ

У 2023 годзе эксперты спрагназавалі захаванне тэндэнцыі ўмеранага аслаблення курса нацыянальнай валюты ў адносінах да замежных валют. З валют фінансісты аддаюць перавагу юаню і расійскаму рублю на фоне пашырэння экспартна-імпартных патокаў паміж Расіяй, Кітаем і Беларуссю, а таксама адсутнасці рызык у такім выпадку, звязаных з валютамі недружалюбных краін. З рызык можна вылучыць узмацненне геапалітычнага напружання паміж КНР і ЗША, што можа прывесці да нязначнага аслаблення юаня.

КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ ПРЫВЯЗАНЫЯ ДА РАСІЙСКАГА РУБЛЯ

Аблігацыі — гэта даўгавыя каштоўныя паперы. Эмітэнтамі аблігацый, або тымі, хто іх выпускае, бываюць як органы ўлады, так і камерцыйныя кампаніі. Паперы таргуюцца на біржы, так што для ўкладанняў у іх спатрэбіцца брокерскі рахунак.

Большасць аблігацый уладкавана так, што па іх рэгулярна выплачваецца працэнтны даход — купоны. У пэўную дату аблігацыі гасяць — выплачваюць намінал, або — суму доўгу па кожнай паперы.

Дата выплат, стаўка і памер купона, а таксама дата пагашэння звычайна вядомыя загадзя. Але бывае, што стаўка і памер купона фіксуюцца толькі да пэўнай даты, а потым могуць змяніцца паводле меркавання эмітэнта.

Існуе мноства аблігацый з самымі рознымі ўмовамі. Яны адрозніваюцца ўзроўнем рызыкі і даходнасці, частатой выплат, тэрмінамі пагашэння і іншымі параметрамі.

Сёлета аблігацыі паказалі добры вынік. Традыцыйна яны заўсёды павінны быць важнай часткай інвестыцыйнага партфеля. У залежнасці ад цыкла ключавой стаўкі варта павялічваць або памяншаць долю доўгіх аблігацый у партфелі (аблігацый з тэрмінам пагашэння ад пяці гадоў).

Літаральна з сярэдзіны лютага 2023 года Міністэрства фінансаў нашай краіны стала прапаноўваць юрыдычным асобам і насельніцтву працэнтныя аблігацыі, намініраваныя ў расійскіх рублях. Меркаваны даход па дадзеных аблігацыях складае 11 % гадавых. Адна аблігацыя прадаецца за 1 тысячу расійскіх рублёў, а даход выплачваецца два разы на год. Дык вось, гэтыя новыя каштоўныя паперы на першасным рынку аблігацый разышліся, як гарачыя піражкі. Толькі за 1,5 месяца быў цалкам прададзены пакет такіх аблігацый агульнай сумай пяць мільёнаў штук.

ЧЫМ БОЛЬШ КВАТЭР, ТЫМ ЛЕПШ

Аддача ад жылой нерухомасці патрабуе значна большых укладанняў. Варта падкрэсліць, што ў дадзеным выпадку ацэньваецца не хуткасць акупнасці інвестыцый (у дачыненні да нерухомасці гэта больш доўгатэрміновы працэс), а магчымасць атрымліваць штомесяц даволі добрую сярэднюю суму. Да таго ж пры куплі кватэры чалавек атрымлівае актыў, які заўсёды будзе з ім.

Кватэра для інвестыцый павінна трапляць у плацежаздольнага арандатара — гэта малады чалавек 30 гадоў з IT-сферы. Больш запатрабаванае жыллё будзе здавацца па максімальна магчымай цане нават ва ўмовах падзення попыту, як тое адбываецца ў апошні час.

Па словах экспертаў, прывабнасць кватэры, перш за ўсё, вызначае яе месцазнаходжанне, якасць пабудовы і рамонту. Гэта значыць павінна быць лакацыя з добрай бытавой інфраструктурай і транспартнай даступнасцю (каля метро). І неабавязкова ў цэнтры Мінска. Гэта можа быць нават жыллё ў раёне станцыі метро «Пятроўшчына».

ЗАЛАТЫ ЗАПАС

Каштоўныя металы — і перш за ўсё золата — лічацца кансерватыўным укладаннем. Яго выкарыстоўваюць не толькі прыватныя інвестары, але і цэнтральныя банкі — у якасці рэзерваў. Так, у 2022 годзе сусветныя цэнтрабанкі купілі рэкордныя аб'ёмы золата.

Пры гэтым ёсць парадокс. Актыў лічыцца надзейным і кансерватыўным, але валатыльнасць у яго бывае як у акцый. Золата цэніцца ўжо некалькі тысяч гадоў і, верагодна, працягне і ў найбліжэйшай будучыні. Пры гэтым рублёвая цана золата залежыць ад цаны металу ў доларах і курса долара да рубля. Атрымліваецца, што золата — валютны актыў.

У золата можна ўкласціся па-рознаму. Напрыклад, ёсць абязлічаныя металічныя рахункі ў банках і біржавыя фонды золата.

Ёсць спосабы купіць золата ў выглядзе металу: інвестыцыйныя манеты, залатыя зліткі. Фізічнае золата не залежыць ад работы фінансавай сістэмы. Нават калі банкі і біржа зачыняцца, манеты і зліткі не знікнуць. Гэта добры выбар для тых, хто чакае сур'ёзных узрушэнняў.

Дарэчы, золата цяпер даражэе, але... Пры куплі-продажы залатых зліткаў у беларускіх банках трэба дакладна разумець памер спрэду. Гэта розніца паміж цаной куплі і продажу, яна па іх складае недзе 20 %. Атрымліваецца, што нават калі ў свеце цана на золата вырасце на 5 %, пры продажы вы застанецеся ў страце на 15 %.

Іншая справа — акцыі фонду, які ўкладвае ў золата. Вы не валодаеце золатам фізічна (аднак яно ёсць, і ім валодае фонд), але ваш капітал расце разам з ростам цаны металу. Здзейсніць здзелку можна праз брокера літаральна за хвіліну, без страт на спрэдзе.

Яшчэ адна парада. Калі вы пачатковец, для пачатку складзіце маленькі «пробны» інвестыцыйны партфель, які не страшна страціць. Як толькі вы ўкладзяце свае грошы, нават невялікія, вам захочацца паглыбіцца ў тэму, пачытаць кнігі і артыкулы, сачыць за навінамі. Праз некалькі месяцаў такой практыкі і назіранняў можна будзе падумаць аб папаўненні рахунку.

КУПІЦЬ НЕАБХОДНАЕ І НЕ ТОЛЬКІ

Шопінг — гэта цалкам нармальна. Асабліва калі даўно хацелі здзейсніць тую або іншую пакупку. Але рэчы лепш купляць свядома, не дапускаць спантанных рашэнняў толькі таму, што выйшла новая мадэль ці вы баіцеся дэвальвацыі. Лепш спачатку адказаць на пытанне, навошта вы тое робіце. І вядома, любыя пакупкі лепш рабіць на дадатковыя грошы — звыш рэзервовага фонду.

Калі ў вас ёсць свабодныя грошы, я параіў бы актыўным і рукастым маладым людзям укласціся ў сябе. І купіць добры камп'ютар. Калі ён патрэбны не для хобі, а для работы, якая прыносіць даход, то гэта правільны выбар. Інвестыцыі ў сродкі вытворчасці — найлепшыя ўкладанні. Таму што ўласны бізнес дае значна больш высокі прыбытак, чым рынак каштоўных папер. Хоць і рызык тут нямала.

Закупляцца ў запас мае сэнс, калі мы дакладна ведаем, што ў будучыні магчымыя перабоі з пастаўкамі пэўных тавараў, а інфляцыя ў краіне хуткая і непрадказальная. Але цяпер нямa перадумоў да таго, каб цэны рэзка раслі, а нейкія тавары знікалі з крамаў. Таму на ўсю суму дакладна макарону купляць не варта.

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На адной хвалі

Пачуць кожнага

Паўфіналісты радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі», якія вытрымалі першы тур адбору, цяпер дэманструюць свае здольнасці на жывых праслухоўваннях. Сёлетні XII Рэспубліканскі творчы радыёконкурс праходзіць пад знакам Года міру і стваральнай працы, і журы спаборніцтва імкнуліся даць магчымасць як мага большай колькасці ўдзельнікаў праявіць сябе на вочных праслухоўваннях у Доме радыё.

Паводле ўмоў, у паўфінале канкурсантам патрэбна выканаць два творы, адзін з якіх ужо быў заяўлены ў папярэднім туры. Адкрылі праслухоўванні ў Вялікай студыі Дома радыё ў панядзелак удзельнікі малодшай узроставай групы ў намінацыі «Інструментальная музыка, акадэмічныя інструменты. Салісты». Праслухаліся таксама канкурсанты ў намінацыях «Інструментальная музыка», «Акадэмічны вакал. Салісты».

А з 26 да 28 красавіка прафесійнае журы ўбачыць выступленні салістаў і ансамбляў у намінацыях «Спадчына». Завершыцца другі этап праслухоўванняў намінацыі «Эстрадны вакал. Салісты» і «Акадэмічны вакал. Салісты», іх удзельнікі выканаюць свае конкурсныя кампазіцыі з 2 да 5 мая.

Яшчэ варта нагадаць, што праслухоўванні канкурсантаў у намінацыях «Інструментальная музыка. Аркестры» і «Харавая творчасць» на ўсіх этапах адбываецца дыстанцыйна. Больш інфармацыі і вынікі шукайце ў эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё і на яго афіцыйным сайце: www.radio1.by альбо ў сацыяльных сетках.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 170

Сваю новую задачу даслаў нам Міхаіл Кошаль з Мінска *(гл. дыяграму)*.

Белыя: Крg1, Фа1, Лf3, Сс1, Кс8, Ке5 (6).

Чорныя: Крd5 (1).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У сталічным Цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі адбыўся турнір па хуткіх шахматах (126 удзельнікаў, у тым ліку тры гросмайстры, тры міжнародныя майстры, восем майстроў FIDE). Перамог гросмайстар Дзяніс Лазавік — 9 балаў з 10. 2-3 месцы падзялілі гросмайстар Андрэй Гаравец і майстар FIDE Арцём Стрыбук — па 8. Найлепшы вынік сярод жанчын — у Ксеніі Норман, сярод ветэранаў — у Ігара Люцко.

Завяршылася 21-я алімпіяда па завочных шахматах (2020-2023). Беларуская зборная падзяліла 9-12 месцы з Расіяй, Іспаніяй і Партугаліяй, а прызавую тройку склалі Германія, Люксембург і ЗША.

На турніры ў Дэлі (1075 удзельнікаў!) Аляксей Аляксандраў фінішаваў на 8-м месцы, Аляксей Фёдараў — на 16-м, Кірыл Ступак — на 19-м.

У бліцтурнірах на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 11-е месца з 552 і 2-е з 439, там жа ў турніры па хуткіх шахматах ён на першых двух этапах перамог вядомых гросмайстраў Данііла Дубава (Расія) і Вінцэнта Каймера (Германія), але потым саступіў Надзірбеку Абдусатораву (Узбекістан).

* * *

Шахматнаму аддзелу ў газеце «Звязда» сёлета спаўняецца **сто гадоў!**

А заснаваў яго ў свой час **Радзівон Канстанцінавіч ШУКЕВІЧ-ТРАЦЦЯКОЎ**. Ён нарадзіўся 23 лістапада 1893 года ў вёсцы Навіны Мінскага павета (па іншых звестках, у сяле Сотніцкае Суджанскага павета Курскай губерні). Пасля заканчэння Мінскага рэальнага вучылішча вучыўся ў Політэхнічным інстытуце ў Пецярбургу. З пачаткам Першай сусветнай вайны пайшоў добраахвотнікам на фронт. Праз два месяцы быў паранены і трапіў у нямецкі палон, дзе працаваў на фабрыцы. Пасля вяртання з Нямеччыны ў снежні 1918 года — на савецкай рабоце, у Чырвонай Арміі — баец, палітработнік, рэдактар газеты «Красноармейская правда» і ваенны цэнзар друку ў Смаленску. З 1922 года працаваў у Галоўпалітасвеце. З лістапада 1922 года да канца 1924 года — старшыня Галоўлітбела. Пэўны час быў і сакратаром Мінскага павятовага камітэта КП(б)Б.

